# БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

№5 (288)

травень 2026

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Інфармацыйны бюлетэнь • Супольнасць беларусаў свету “Бацькаўшчына”


**У НУМАРЫ:**

## Сяржук Шаліга: у Амерыцы цэлыя раёны выхадцаў у трэцім-чацвёртым пакаленні з Беларусі

Як у Філадэльфіі з’явіліся бел-чырвона-белы сцяг і маскі з Венецыі, пра святкаванні Дня Волі і Купалля, ды навошта ўсё гэта патрэбна беларусам, якія з’ехалі з Радзімы ў мінулым стагоддзі, распавёў кіраўнік Belarus FREEDOM-Philadelphia Сяржук Шаліга.

Старонка 4





НЕ ВАЙНЕ!

ВЫ МОЖАЦЕ ДАПАМАГЧЫ


# Павал Шаўцоў: мой кар’ерны рост у Скарынаўцы пачаўся з пыласоса

15 траўня Скарынаўская бібліятэка і музей у Лондане адзначаюць 55-годдзе. Гэтае месца стала адным з галоўных асяродкаў захавання беларускай культуры, архіваў і памяці па-за межамі Беларусі. Як прыватная калекцыя святароў ператварылася ў вялікую беларускую інстытуцыю? Чым сёння жыве бібліятэка, і чаму даследчыкі з усяго свету едуць менавіта сюды? Гутарка пра гэта з апекуном Скарынаўкі Паўлам Шаўцовым.

**– Распавядзіце, калі ласка, з чаго пачыналася стварэнне бібліятэкі?**

– Спачатку бібліятэка была як прыватная калекцыя біскупа Чэслава Сіповіча і некалькіх іншых святароў. Тады яна знаходзілася ў іншым будынку. Айцец Чэслаў пачаў збіраць кнігі пасля таго, як з Ватыкана прыехаў у Брытанію пасля Другой сусветнай вайны.

Гэтая калекцыя настолькі разраслася, што пачала правальвацца столь, і тады ў 1969 годзе святары вырашылі: трэба арганізоўвацца і купляць новы дом. Якраз суседні дом выйшаў на продаж, і беларуская дыяспара выкупіла яго, фізічна ўсё перанесла – калекцыю, якая ўжо налічвала каля 10 тысяч кніг, – і заклала гэта ўжо юрыдычна як асобны дабрачынны фонд паводле брытанскага права. І прыватная калекцыя ператварылася ў паўнавартасную ўстанову – charity fund.

**– Павал, як вы сталі апекуном Скарынаўскай бібліятэкі?**

– Калі бібліятэка стваралася ў сучасным выглядзе, а гэта былі 1970-я гады, тады апекуноў прызначылі. Зараз яна кіруецца радай апекуноў. На пачатку дзейнасці ўстановы туды ўваходзілі як беларусы, так і брытанскія даследчыкі, беларусазнаўцы – такія як Арнольд Макмілін, Джым Дынглі, Гай Пікарда. І паводле статуту рада апекуноў можа прызначаць новых апекуноў.

Працяг на старонцы 6.

навіны

# ПАСЛЯ ПЕРАПЫНКУ АДНАВІЎ ПРАЦУ САЙТ КУЛЬТАВАЙ ГАЗЕТЫ АМЕРЫКАНСКАЙ ДЫЯСПАРЫ “БЕЛАРУС”

Пасля перапынку газета ізноў будзе існаваць у віртуальнай прасторы на адрасе: belarus-news.us




Рэдакцыя паведамляе, што па некаторых уважлівых прычынах ранейшы сайт газеты працяглы час не быў даступны і ўрэшце яго былі вымушаны зачыніць. Адбыліся неабходныя змены ў складзе рэдакцыі газеты, сучасны склад наступны:

• Ганна Сурмач – адказная рэдактарка
• Яўген Папко – намеснік адказнага рэдактара
• Таццяна Красоўская – скарбніца
• Наталля Федарэнка – сябра
• Вячаслаў Бортнік – сябра
• Сяргей Кудзеліч – сябра
• Алесь Кот (Канада) – сябра
• Яўген Папкоў – сябра
• Вадзім Албут – сябра

Інфармацыя, якая захоўвалася ў рэдакцыйным партфелі за той час, калі не працаваў сайт, не будзе страчанаю, усё будзе ўключана ў наступны, другі ,нумар “Гадавіка”, які будзе ахопліваць падзеі ад жніўня 2023 года па пачатак кастрычніка 2025 года.

На гэтым новым сайце газеты вы можаце знайсці інфармацыю пра беларускае жыццё ў ЗША і Канадзе ад кастрычніка 2025 года.

Газета “Беларус” адзначыла свой 75-гадовы юбілей 20 верасня 2025 года. Газета была адзіным прэсавым органам для беларусаў Амерыкі і часткова для беларусаў Канады. Хацелася б, каб яна выконвала гэтую ролю і надалей. Цяпер мы маем два асноўныя кірункі дзейнасці:

– падтрыманне сайта газеты ў віртуальнай прасторы, які забяспечвае больш актуальную падачу навінаў і больш даступныя кантакты з чытачамі,

– выданне пісьмовага варыянта газеты ў выглядзе “Гадавікоў”, менавіта гэты варыянт забяспечвае захаванне інфармацыі для гісторыі, незалежна ад абставінаў.

Рэдакцыя запрашае да актыўнай супрацы ўсе беларускія асяродкі ў ЗША і Канадзе.

Паводле belarus-news.us

# У ПОЛЬШЧЫ ЗАВЯЛІ КРЫМІНАЛЬНУЮ СПРАВУ ПА ФАКЦЕ АТАКІ НА ІНТЭРНЭТ-БІБЛІЯТЭКУ KAMUNIKAT.ORG

Беластоцкі аддзел цэнтральнага бюро паліцыі Польшчы па барацьбе з кіберзлачыннасцю распачаў крымінальную справу па факце хакерскай атакі на інтэрнэт-бібліятэку kamunikat.org, якая адбылася ў ноч на 7 траўня.

Пра гэта “Радыё Свабода” паведаміў заснавальнік інтэрнэт-бібліятэкі і дырэктар аднайменнага выдавецтва Яраслаў Іванюк, які 11 траўня меў гутарку з супрацоўнікамі бюро.

“Напісаў заяву. Мне задавалі вельмі дакладныя пытанні. І па выніку ў мяне ўражанне такое, што супрацоўнікі бюро паставіліся вельмі сур’ёзна да сітуацыі”, – сказаў Іванюк.

Ён апавёў паліцыянтам пра тое, што 3 сакавіка сайт у Беларусі прызналі “экстрэмісцкім фармаваннем”, што папярэдняя спроба ўзлому была летась у снежні. А таксама перадаў логі адрасоў, з якіх ішла атака.

“Мне сказалі, што, магчыма, даведаюцца, адкуль атака была праведзена”, – сказаў Іванюк.

Паводле яго, крымінальную справу могуць перадаць у Агенцтва ўнутранай бяспекі.

“Сказалі, што зважаючы на дзеянні рэжыму Лукашэнкі супраць мяне і kamunikat.org, магчыма, што справа будзе перададзеная да гэтай польскай спецслужбы”, – паведаміў Яраслаў Іванюк.



kamunikat.org (Web Screenshot)

Паводле яго, праца па аднаўленні матэрыялаў інтэрнэт-бібліятэкі працягваецца.

Чым важны Kamunikat.org для беларускай культуры

У выніку хакерскага была нападу парушаная праца беларускай інтэрнэт-бібліятэкі Kamunikat.org.

Паводле Яраслава Іванюка, Kamunikat.org ва ўмовах узмацнення рэпрэсіяў супраць беларускай культуры і мовы быў не толькі бібліятэкай, але і інструментам аховы культурнай спадчыны, а таксама платформай, якая падтрымлівае свабодны доступ да ведаў і незалежнай творчасці.

На серверах захоўваецца больш за 70 тысяч рознага тыпу беларускіх публікацый – кнігі, газеты, часопісы, аўдыёкнігі, відэа- і аўдыёматэрыялы пра Беларусь.

“Летась прызналі наш сайт месцам, дзе трымаюцца „экстрэмісцкія матэрыялы“, пазней увогуле прызналі нас „экстрэмісцкім фармаваннем“, менская пракуратура вырашыла, што змест кнігі Дароты Міхалюк пра БНР, якую мы выдалі, „нясе пагрозу інтарэсам Рэспублікі Беларусь“. Таму тое, што здарылася гэтай ноччу, – гэта працяг”, – заявіў “Радыё Свабода” Іванюк.

Беларуская інтэрнэт-бібліятэцы Kamunikat.org, якая была заснаваная і папаўняецца ў Беластоку, летась споўнілася 25 гадоў.

Яе наведнікі – пераважна беларусы.

Акрамя інтэрнэт-бібліятэкі “Камунікат”, Яраслаў Іванюк пазней стварыў аднайменнае выдавецтва.

svaboda.org



# ПАЛІТЗНЯВОЛЕНАГА ЛІДАРА ГУРТА “ПАЛАЦ” АЛЕГА ХАМЕНКУ ПРЫЗНАЛІ “ЭКСТРЭМІСТАМ”

Гэта вынікае з абноўленага спісу на сайце МУС.

Алег Хаменка – радыёвядоўца, кампазітар, музыка і прадзюсар. У сакавіку 2026 года яго асудзілі на тры гады калоніі – яго абвінавацілі паводле артыкула аб спрыянні “экстрэмісцкай” дзейнасці (артыкул 361-4 КК) і прызначылі штраф памерам больш за 20 тысяч рублёў.

Музыку ставілі ў віну супрацоўніцтва з СМІ, якое знаходзіцца ў спісе “экстрэмісцкіх фармаванняў” – “Беларускае Радыё Рацыя”.

Апрача Хаменкі ў спіс трапілі яшчэ 18 чалавек. Цяпер у спісе 6650 чалавек.

Паводле mediazonayb.com

навіны

# ПРЭЗІДЭНТ ПОЛЬШЧЫ ЎРУЧЫЎ АНДЖЭЮ ПАЧОБУТУ ОРДЭН БЕЛАГА АРЛА

Сёння ў Варшаве прэзідэнт Польшчы Караль Наўроцкі ўручыў журналісту і былому палітвязню Анджэю Пачобуту ордэн Белага Арла – найвышэйшую дзяржаўную ўзнагароду Польшчы.

Гэта адбылося падчас урачыстай цырымоніі, прысвечанай Дню Канстытуцыі 3 траўня.

“Як гісторык і былы старшыня Інстытуту нацыянальнай памяці я не пабаюся сказаць, што Анджэй Пачобут – гэта герой і нязломны чалавек”, – сказаў Наўроцкі.

“Анджэй Пачобут стаў на нашых вачах сімвалам упартасці, адданасці каштоўнасцям, якія ён вызнае, і барацьбы за правы чалавека”.

Караль Наўроцкі ўганараваў Анджэя Пачобута ордэнам яшчэ летась 11 лістапада, у Дзень незалежнасці Польшчы, калі Пачобут яшчэ быў за кратамі.

Прэзідэнт Польшчы зрабіў гэта на знак прызнання выбітных заслуг Пачобута ў дзейнасці на карысць палякаў у Беларусі, ягонай барацьбы за правы чалавека і нязломнай пазіцыі ў супрацьстаянні з праявамі таталітарных рэжымаў, – гаворыцца ў паведамленні прэзідэнцкай канцылярыі.

Днём раней Анджэя Пачобута з жонкай Аксанай запрасіў на вячэру прэм’ер-міністр Польшчы Дональд Туск. Пра гэта ён паведаміў у сацсетцы X.

“У Дзень Палоніі запрасіў на вячэру Аксану і Анджэя. Размаўлялі пра Польшчу, пра свабоду і будучыню”, – напісаў прэм’ер-міністр.

Анджэй Пачобут – журналіст, блогер, актывіст польскай меншасці ў Беларусі і даўні карэспандэнт польскага выдання “Gazeta Wyborcza”. Яго арыштавалі ў 2021 годзе і асудзілі ў 2023 годзе за меркаваную “варожую дзейнасць” і “распаўсюджванне нянавісці”. 28 красавіка 2026 года яго вызвалілі і вывезлі ў Польшчу.


KPRP (Social Media)

Ордэн Белага Арла – найстарэйшая і найвышэйшая дзяржаўная ўзнагарода Рэспублікі Польшча, якая ўручаецца за выдатныя грамадзянскія і ваенныя заслугі на карысць Рэспублікі Польшча. Ордэн уручаецца найбольш выбітным палякам і вышэйшым прадстаўнікам замежных дзяржаў.

svaboda.org

# АЛЯКСЕЙ ПАЛУЯН АТРЫМАЎ УЗНАГАРОДУ ЗА ПРАЕКТ ПРА ВАЙНУ ВА УКРАІНЕ І СУРАГАТНАЕ МАЦЯРЫНСТВА

Гаворка пра стужку “Інкубатар”, з якой ён сёлета ўдзельнічаў у праграме Berlinale Talents. У межах конкурсу праект атрымаў узнагароду Berlinale Talents Lab Awards, якую беларусу ўручыў знакаміты нямецкі рэжысёр Том Тыквер. Узнагароджанне адбылося на фестывалі ў Канах, піша тэлеграм-канал “Свяшчэнны Белавуд”.

Сюжэт “Інкубатара” наступны: Марыя, беларуская маці, трапляе ў сумнеўны свет сурагатнага мацярынства ва Украіне, каб вызваліць свайго мужа, Віктара, ад дзевяцігадовага турэмнага прысуду пры рэжыме Лукашэнкі. Але калі пачынаецца вайна, яны разам са сваім нованароджаным дзіцем – прызначаным для нямецкай пары – апынаюцца ўцягнутымі ў рэаліі штодзённага ваеннага жыцця.

“Інкубатар” – другі поўнаметражны ігравы праект, які Палуян плануе рабіць пасля здымак стужкі “Спадчына”. Праца над фільмам ідзе ўжо два гады. Ён будзе створаны ў капрадукцыі Францыі і Германіі.

budzma.org





# У ГАЛОЎНЫМ ТЭАТРЫ ДАНІІ АДЗНАЧЫЛІ СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ СВАБОДЫ ДРУКУ ВЫСТАВАЙ ПЛАКАТАЎ І СПЕКТАКЛЕМ ПРА РУСЛАНА КУЛЕВІЧА

29 красавіка ў Skuespilhuset, галоўным тэатры Даніі, адбылася маштабная акцыя салідарнасці з незалежнай журналістыкай. Прэм’ера спектакля “The Last Witness (of Old Hrodna)”, заснаванага на рэальнай гісторыі гродзенскага журналіста Руслана Кулевіча, была прымеркавана да Сусветнага дня свабоды друку ААН.

Візуальным кантэкстам для дацкай публікі стала выстава плакатаў мастака Pan Zmi Thor (@zmithor). Ён прадставіў глыбокі палітычны і гістарычны аналіз сувязяў Беларусі з Еўропай. Плакаты змясцілі ў сабе маніфест захавання ідэнтычнасці: ад гістарычных сувязяў з Даніяй (каралева Сафія Мінская) і адмены смяротнага пакарання да неабходнасці дэкамунізацыі і вяртання да лацінкі.

Вечар завяршыўся дыскусіяй аб выкліках, з якімі сутыкаюцца медыя ў часы цэнзуры і вайны. У дэбатах узяла ўдзел вядомая журналістка-аналітык Ганна Любакова. Удзельнікі абмеркавалі ролю журналіста як “апошняга сведкі”, які застаецца верным праўдзе, нягледзячы на рэпрэсіі.

“Мае працы ў Skuespilhuset – гэта тлумачэнне для еўрапейцаў: Беларусь – гэта не “белая пляма”, а еўрапейская краіна са сваёй гісторыяй і выразным вектарам развіцця”, – адзначыў Pan Zmi Thor.

Паводле прэс-рэлізу

гутарка

# Сяржук Шаліга: У Амерыцы цэлыя раёны выхадцаў у трэцім-чацвёртым пакаленні з Беларусі

Як у Філадэльфіі з'явіліся бел-чырвона-белы сцяг і маскі з Венецыі, пра святкаванні Дня Волі і Купалля, ды навошта ўсё гэта патрэбна беларусам, якія з'ехалі з Радзімы ў мінулым стагоддзі, распавёў кіраўнік Belarus FREEDOM-Philadelphia Сяржук Шаліга.

Суполка беларусаў Філадэльфіі ўзнікла ўлетку 2020-га. Калі адчулі надзею, што ў гэты раз, нарэшце, штосьці можа змяніцца.

– Мая жонка Воля прапанавала яднацца і нам, беларусам Філадэльфіі, калі мы пабачылі мітынгі ў розных кутках Беларусі. Калі пабачылі вялікі мітынг у родным Наваполацку ў падтрымку Святланы Ціханоўскай. Калі пачалі падымацца беларусы Злучаных Штатаў. Сан-Францыска, Нью-Ёрк, Чыкага…

Мы далучыліся ды кінулі кліч у фэйсбуку. Былі ўражаныя, колькі беларусаў сабралося на наш самы першы івэнт. Але ж драйверам стала не вельмі прыемная сітуацыя…

Рыхтуючыся да першага івэнту, Сяржук і Воля напісалі яе сяброўцы ў Менск, ведаючы, што муж яе – вядомы блогер MozgON Уладзімір Цыгановіч.

– Звярнуліся, каб ён распавёў на сваім канале пра нашу акцыю ў Філадэльфіі. Але калі дазваніліся, даведаліся, што Валодзю арыштавалі, а пасля асудзілі на велізарны тэрмін, разам з Ціханоўскім, Лосікам, Статкевічам.

Уладзімір і сёння за кратамі. Таму



на кожным нашым івэнце партрэт Цыгановіча, распавядаем пра яго лёс, робім усё магчымае, каб вызваліць з лукашэнкаўскіх кіпцюроў.

Пазней мы пазнаёміліся з музыкамі з гурта Tor Band, якія сталі душой пратэсту. Яны не маглі прыехаць у Штаты, і мы зладзілі віртуальны канцэрт намаганнямі АБА.

Музыкі Tor Band, на вялікі жаль, зараз таксама за кратамі. Таму разам з партрэтам Валодзі Цыгановіча ў нас заўсёды побач і партрэт гурта Tor Band.

**– Суполка беларусаў Нідэрландаў збірае на Купалле 200-300 чалавек, некаторыя нават прыязджаюць на святкаванне з Беларусі. Але ж некаторыя баяцца прыходзіць, бо сцягі ды ці мала што. Як у вас?**

– У нас два вялікія святы штогод – Дзень Волі і Купалле. На Дзень Волі прыходзіць каля 300-400 чалавек.Іванка Сурвіла кожны год дасылае нам асабісты ліст віншаванняў для беларусаў Філадэльфіі на Дзень Волі.

Купалле мы праводзім у дзяржаўных парках, дзе абмежавана колькасць наведвальнікаў. Таму максімум было 120 чалавек. Сёлета знайшлі прыватную пляцоўку ды плануем запрасіць больш беларусаў.

Дзень Волі – палітычнае мерапрыемства, Купалле больш пра беларускую гісторыю і традыцыі. Таму тыя, хто баіцца палітыкі і сцягоў, ідуць да нас на Купалле.

Ладзім яго ўжо шосты год. Танчым у лесе, пяём песні, цэлы рытуал ёсць, калі людзі праходзяць праз спецыяльную браму. Робім спартыўную віктарыну, уначы у нас сайлент дыска (удзельнікі танчаць у бесправаднывых навушніках, каб не перашкаджаць іншым).

Што тычыцца страху, то мы з'ехалі з Беларусі 27 год таму. У маёй жонкі ў Беларусі нікога не засталося, маёмасці ў нас там няма. У мяне засталася мама.

Я не быў у Беларусі з 2017-га, але ж на мяне там заведзена крымінальная справа за маю дзейнасць у Амерыцы. За тое, што 24 лютага 2022-га абліў чырвонай фарбай лукашэнкаўскі сцяг. Для мяне гэта сімвал крыві ўкраінцаў на руках Лукашэнкі і яго паплечнікаў.

Мяне нават аб'явілі ў вышук у Беларусі і Расіі. І да маёй мамы перыядычна прыходзяць "госці", КДБ ці Следчы камітэт. Не ведаю, што яшчэ больш яны могуць зрабіць.

Што тычыцца іншых беларусаў ды іх страху, то на кожным івэнце мы робім аб'яву, што ў нас ёсць маскі, ці можаце надзець свае.

Але з гэтага года, адпаведна з пазіцыяй Трампа да мігрантаў, у беларусаў з'явіўся яшчэ адзін вялікі страх. Тыя, хто прыехаў пасля 2020-га, – у большасці палітычныя ўцекачы. Яны тут легальна, але іх кейсы зараз разглядаюцца ў дзяржсістэме, чакаючы рашэння суду.

Былі ўжо выпадкі, калі такія беларусы прыходзілі ў міграцыйную службу на тэрміновую праверку (ладзяцца кожны год), а іх затрымлівалі ды адпраўлялі ў нешта падобнае да нашага СІЗА.

Здаралася, калі беларус сядзеў там месяцы, чакаючы рэзюмэ па затрыманні. Без аніякіх аргументаў – праверка і ўсё.

Наша суполка дапамагае беларусам, што апынуліся ў такой цяжкой сітуацыі праз сувязі з мясцовымі ўладамі, кангрэсменамі і сенатарамі.

Гэта вельмі новая для нас справа. Да прыходу Трампа такога "палявання" на мігрантаў у Штатах не было. Гэта звязана з яго асабістай міграцыйнай палітыкай. Кангрэсмены і сенатары ад дэмакратаў ці адэкватныя рэспубліканцы падаюць позвы ў амерыканскія суды, каб прызнаць гэту практыку незаконнай. І яна датычыцца не толькі беларусаў.

Сітуацыя, на жаль, вельмі нагадвае нам Беларусь. Чалавека могуць трымаць месяцы, нічога не кажучы – "разбіраемся". У большасці такія беларусы абсалютна законапаслухмяныя, няма ніякіх крымінальных спраў.

Былі сітуацыі, калі беларуская сям'я прыходзіла на гэтую праверку, а пасля жонку з дзіцём адпускалі, а мужа затрымлівалі на некалькі месяцаў. Потым вызвалялі не без нашай дапамогі.

**– Бачу фота студзеня 2022-га ў вашай стужцы, дзе побач з чырвона-зялёным сцягам на слупе ліхтара вісіць наш б-ч-б.**

– Яшчэ ў 2020-м мы ішлі калонай па Алеі сцягаў Філадэльфіі. Уздоўж вуліцы вісяць сцягі 146 краінаў, у тым ліку і РБ. Тады на маіх плячах быў павязаны бел-чырвона-белы. І я падумаў: а што, калі дадам да слупа наш сапраўдны сцяг? Забраўся на слуп ды павязаў.

І нарадзілася такая традыцыя. Наша арганізацыя – захавальніца сапраўднага беларускага сцяга на гэтай амерыканкай алеі. Гарадскія ўлады пра гэта ведаюць, разумеюць і дазваляюць.

З офісам мэра Філадэльфіі штогод падымаем наш бел-чырвона-белы сцяг, калі ўдзельнічаем у праграме "Уздымі свой сцяг". Мы не можам узняць яго на гарадскім флагштоку, але ўздымаем яго, вялікі-вялікі, побач. І такім чынам адзначаем Дзень Волі.



Нядаўна мы былі на мерапрыемстве ў Браяна Фіцпатрыка, нашага мясцовага кангрэсмэна, які падтрымлівае Беларусь і Украіну. Амерыканцы амаль не ведаюць, што такое Беларусь, дзе яна знаходзіцца і пра яе праблемы. Мы распавядалі не толькі пра культуру, гісторыю і месца знаходжання, але і пра палітычную сітуацыю. Пра тое, што ў нас ёсць дыктатар, з якім змагаемся, але ж нам трэба і перамагчы.

Гістарычна Нью-Ёрк, Філадэльфія і Чыкага – тры гарады, куды беларусы ехалі да рэвалюцыі 1917-га. Тады ў Амерыку на працу ездзілі цэлыя вёскі. Працавалі на заводах, фермах, маглі жыць там па годзе і вярталіся адпачываць дадому.

Зараз у Амерыцы цэлыя раёны, дзе жывуць выхадцы ўжо ў трэцім-чацвёртым пакаленні з Беларусі, Польшчы, Літвы і Украіны. Хваля дзевяностых-нулявых – гэта мы ўжо ехалі да сваіх, у тыя ж месцы.

**– А што за венецыянскія маскі ў бел-чырвона-белых колерах?**

– Калісьці ў нас з жонкай быў бізнэс, інтэрнэт-крама, дзе мы прадавалі такія маскі. Атэлье ў Венецыі рабіла іх для нас з пап’е-машэ на замову.

У 2020-м я папрасіў сваіх сяброў з Венецыі зрабіць серыю бел-чырвона-белых масак. Зараз мы прапануем іх тым беларусам на нашых імпрэзах, хто клапаціцца пра бяспеку.

**– А як прайшла ваша сустрэча з Святланай Ціханоўскай і потым з Сяргеем?**

– У нас пазіцыя, што мы падтрымліваем культуру і традыцыі Беларусі, усіх прымаем, але не падтрымліваем нічый бок. Ёсць іншыя суполкі беларусаў Амерыкі, якія, напрыклад, топяць за Зянона і нават размаўляць з іншымі прадстаўнікамі не жадаюць.

Мы запрашаем усіх, бо дапамагаем розным гасцям сустрэцца з беларусамі Філадэльфіі. Прыязджалі палітыкі, мы дапамагалі ладзіць тут канцэрт Міхалка, J:Морса, Лявона Вольскага і шмат каго яшчэ.

Мы сустрэліся з Святланай яшчэ ў Нью-Ёрку, падчас яе першага візіту ў ЗША. Яна выступала ў ААН, а пасля мітынгу ўдалося пазнаёміцца і паразмаўляць. Два гады таму яна прыехала да нас у Філадэльфію. Працуем і з яе камандай, Франакам Вячоркам.

Святлана – адкрыты чалавек, і беларусам вельмі прыемна з ёй сустракацца. Таму наша мерапрыемства атрымалася дужа цёплым.

Тое самае магу сказаць і пра сустрэчу з Сяргеем Ціханоўскім. Прыйшло шмат людзей, яго вельмі цёпла прымалі і падтрымалі. Бо, здаецца, калі Сяргей даехаў да нас, прайшоў усяго месяц ад яго вызвалення з турмы. І ён потым нам распавёў, што Філадэльфію запомніў як адну з самых лепшых і добрых сустрэч з беларусамі.

**– Хтосьці падумае, што вы з’ехалі з Беларусі яшчэ ў мінулым стагоддзі – то што вам да яе праблем?**

– Мы шмат пра гэта размаўлялі. Глядзіце, чалавек спачатку дасягае сваіх мэтаў, каб атрымалася добрая праца, дзеці выраслі. Але, калі ты ўжо не марнуеш свой час, каб выжыць, як гэта было ў нас тут спачатку, – з’яўляецца жаданне штосьці аддаваць. Напраўду гэта не так пафасна, бо дапамагаючы іншым, мы таксама штосьці атрымліваем і для сябе. Мы ва ўласных вачах вырастаем, бо нам прыемна дапамагаць. І людзі кажуць нам “дзякуй”.

Зрабілі Дзень Волі – нам кажуць: “Як жа прыемна! Дзякуй! Вы Naviband да нас прывезлі!” Ці людзі прыехалі на Купалле, узгадалі дзяцінства, прывезлі сваю сям’ю, распавялі малым пра наша беларускае свята.

Ці калі беларускаму палітычнаму ўцекачу патрэбен наш ліст падтрымкі, каб вырашыць свой кейс. Мы яго ведаем і, канечне ж, дапаможам. Бо дзякуючы нашаму лісту беларус выйграе суд у Амерыцы. Уяўляеце яго эмоцыі і падзяку?

Вельмі-вельмі прыемна дапамагчы суайчынніку! Гэта надзвычай моцны рухавік і стымул. І тое, што прыдае сэнс і радасць нашаму жыццю.

gazetaby.com

навіны

# Франак Вячорка: У нас афігенная дыяспара, але ныццё пра тое, што ўсё кепска, дэматывуе, мы не ўмеем прадаваць поспехі

“У нас афігенная дыяспара, яна абсалютна неверагодная. І калі раней казалі: трэба павучыцца ў габрэяў, яшчэ ў кагосьці, – зараз усе вучацца ў нас і нам трэба проста разбудоўваць гэты патэнцыял, наколькі магчыма”. Такое меркаванне выказаў галоўны дарадца Святланы Ціханоўскай Франак Вячорка на дыскусіі “Палітычная адвакацыя: выклікі і магчымасці” ў межах V Канферэнцыі беларусаў свету (1-2 траўня, Варшава).



Паводле слоў дарадцы дэмлідаркі, палітыкам, палітычным структурам, самому офісу Ціханоўскай “не хапае вельмі часта канкрэтных кейсаў” той ці іншай праблемы.

“Бывае, прыязджаем на сустрэчу, усе ныюць: усё кепска, нічога не выдаецца (напрыклад, дакументы. – “Позірк”.). Потым пачынаеш капаць: ніводнага канкрэтнага кейса, які можна было б узяць, вырашыць”, – заявіў Вячорка.

“Калі ў нас будуць канкрэтныя прыклады, прэцэдэнты, якія мы ствараем і вырашаем, потым іх лёгка маштабаваць на ўсю беларускую супольнасць”, – падкрэсліў ён.

“Аднаго ныцця пра тое, што ўсё кепска, недастаткова, – лічыць Вячорка. – Калі мы будзем казаць, што ўсё кепска, не вырашаецца, мы толькі дэматывуем і нашых партнёраў, і нашыя структуры”.

На думку дарадцы, трэба акцэнтаваць увагу на поспехах, але “мы не ўмеем прадаваць сябе, прадаваць свае поспехі”. “Думаю, што тут (у Польшчы. – “Позірк”.) і па выніках гэтай канферэнцыі нам трэба паспяховыя прыклады запакаваць, раскруціць, паказаць іншым суполкам у іншых краінах, дзе меншая беларуская дыяспара, як гэта было вырашана. Супраца офіса, напрыклад, з іспанскай дыяспарай у справе прызнання пратэрмінаваных пашпартоў – выдатны прыклад”, – заявіў прамоўца.

На яго перакананне, толькі супрацай дэмакратычных структур, палітыкаў, “якія адкрываюць дзверы”, і суполак на месцах можна дасягнуць выніку. “Калі мы будзем дзейнічаць паасобку, мы не адкрыем дзверы альбо не давядзем справу да канца”, – заявіў Вячорка.

Паводле яго слоў, вырашэнне канкрэтных праблем, іх маштабаванне на наступны год павінна стаць прыярытэтам.

pozirk.online

# Акцыя салідарнасці ў Беластоку да Дня палітвязняў

У Беластоку 21 траўня да Дня палітвязняў прайшла акцыя салідарнасці. Яна сабрала каля 40 чалавек – прадстаўнікоў беларускай дыяспары, былых палітвязняў, журналістаў. Шмат згадвалася пра Вітольда Ашурка, у памяць якога і была выбраная трагічная майская дата – дзень гібелі палітвязня ў шклоўскай калоніі. Шмат гаварылася пра пераслед і мацаванне беларускай салідарнасці, пра тое, што не застаецца юрыдычных механізмаў абароны людзей і толькі грамадская падтрымка можа хоць неяк змяняць сітуацыю. Выказвалася надзея на вызваленне ўсіх палітычных вязняў і ўрэшце спыненне рэпрэсій.

Удзельнікі акцыі нязменна падкрэслівалі, што трэба выходзіць на такія акцыі па ўсіх гарадах свету і нагадваць пра жахлівы пераслед людзей у Беларусі за іншадумства. Пакуль у Беларусі здзяйсняюцца жорсткія рэпрэсіі – маўчаць нельга.

hpravy.org



юбілей

# Павал Шаўцоў: МОЙ КАР’ЕРНЫ РОСТ У СКАРЫНАЎЦЫ ПАЧАЎСЯ З ПЫЛАСОСА

Працяг са старонкі 1.

Калі ў 1990-я гады я прыехаў, то прыйшоў сюды, у беларускі цэнтр. Шчыра кажучы, маё першае заданне было – пыласосіць бібліятэку. Айцец Надсан спытаў, што я ўмею рабіць. Я яму расказаў, што я ўмею, а ён кажа: “Гэта ўсё добра, але ці можаш ты пыласосіць?” Я кажу: “Так”. Дык вось, мая першая праца была такая. Мой кар’ерны рост пачаўся з пыласоса.

А пасля я ўжо пару гадоў тут пабыў, айцец прыглědзеўся да мяне і сказаў: “А хочаш стаць апекуном?” Бо я па прафесіі юрыст. І ён кажа: “Якраз ты будзеш нешта дадаваць, і ты чалавек маладзейшага веку”. І я згадзіўся. У 1999 годзе мяне прызначылі адным з апекуноў Скарынаўкі.

**– Якая асноўная функцыя апекуноў?**

– Апекуны – гэта як дырэктары бізнесу. Яны глядзяць, каб установа развівалася. Мы збіраемся, абмяркоўваем, ці ўсё добра працуе.

Некаторыя апекуны выконваюць больш назіральную функцыю, бо не маюць часу ўдзельнічаць у штодзённых справах. Іншыя, хто мае больш часу, займаюцца і штодзённай працай разам з валанцёрамі. Цяпер у нас шэсць апекуноў. Гэта ўжо ўсе людзі, прызначаныя пасля таго, як старэйшае пакаленне адышло.

Частка апекуноў займаецца яшчэ і іншымі справамі бібліятэкі, а частка – гэта больш функцыя дырэктараў, якія проста сочаць, каб установа працягвала развівацца ў гаспадарчым, навуковым сэнсе і выконвала сваю місію.

Бо рада апекуноў – гэта людзі, якія збіраюцца раз-пораз і глядзяць на агульную карціну, як дырэктары. А чаго нам заўсёды не хапае – гэта людзей, якія дапамагалі б у штодзённай працы.

**– Што вы робіце, каб вырашыць гэтае пытанне? Хто дапамагае вам у штодзённай працы?**

– У нас ёсць кола валанцёраў. Мы падзялілі працу на шэсць падкамітэтаў, якія займаюцца рознымі справамі. Ёсць падкамітэт, які працуе з людзьмі і арганізуе мерапрыемствы. Ёсць тыя, хто займаецца зборам кніг і архіваў. Ёсць камітэт па сувязях з журналістамі і медыя. Ёсць фінансавы камітэт, ёсць камітэт па наглядзе за будынкам, айцішны камітэт – вельмі розныя рэчы.

Мы вельмі радыя людзям, якія хочуць дапамагаць. Бо бібліятэка не мае дзяржаўнага фінансавання, таму большая частка працы – валанцёрская.

І таму нам трэба шмат валанцёраў – у розных кірунках. Кожны можа чымсьці дапамагчы – на месцы ці дыстанцыйна. Напрыклад, з сайтам нам дапамагаюць людзі з Польшчы.

**– Падлогу пыласосіць, я так разумею, таксама ёсць каму?**

– Канечне. Гэта арганізуе камітэт па наглядзе за будынкам. Ён жа займаецца і арганізацыяй будаўнічых прац. Бо пыласосіць – гэта адна справа, але мы ж яшчэ ўвесь час развіваемся, разбудоўваемся, расцём. Вось, напрыклад, апошні наш вялікі набытак – карціны беларускіх мастакоў: іх трэба было прывезці і неяк павесіць на сцяну, бо яны займаюць паўсцяны, па два метры шырынёй.

**– А што за карціны? Раскажыце пра скарбы вашай бібліятэкі.**

– Карціны – гэта наш апошні вялікі набытак. З намі звязаўся чалавек з Фларыды. Яны паходжаннем з Беларусі і вырашылі перадаць сваю калекцыю беларускага мастацтва нам. Гэта 15 карцін сучасных мастакоў – Цвіркі, Клінава і іншых.

І вось гэтыя карціны толькі што пераехалі праз акіян і апынуліся ў нас. Чалавек перадаў іх як данат, а мы ўжо аплацілі перавозку і страхоўку. І наогул за апошнія гады шмат скарбаў паступае ў нашую бібліятэку з прыватных калекцый.

Напрыклад, у нас ёсць вельмі багатая калекцыя старажытных мапаў. Там і Рэч Паспалітая, і Расійская імперыя. Яна трапіла да нас у 2001 годзе. Гэта быў Віктар Астроўскі, які ўсё жыццё збіраў мапы. Пры жыцці ён частку падараваў бібліятэцы, а пасля смерці нам перадалі ўсю калекцыю.

Тое самае са стардрукамі. Людзі іх куплялі, збіралі, а пасля перадавалі – пры жыцці або пасля смерці. І архівы таксама. Напрыклад, архіў кампазітара Міколы Куліковіча – ноты, запісы, паперы – усё гэта захоўваецца ў нас.

І вось яшчэ Галіна Казіміроўская працавала з архівам Куліковіча. Яшчэ ў 1970-я гады ўсё гэта ляжала ў скрынях, пакуль даследчыкі не пачалі вывучаць. Так што вельмі шмат рэчаў прыходзіць менавіта з прыватных калекцый, а не толькі купляецца.

**– Пры бібліятэцы існуе музей. Можаце распавесці пра яго гісторыю?**

– Мы займаемся разбудовай музея, яго плошча стала большай. Музей заўсёды быў, з самага пачатку існавання бібліятэкі, але раней ён размяшчаўся ў адным пакоі, і ў ім адсутнічала якая-небудзь канцэпцыя – проста была выстаўлена вялікая колькасць розных каштоўных экспанатаў.

А цяпер у нас пад музей з’явілася большая прастора. Спадарыня Каралiна (Каралiна Мацкевіч – апякунка і куратарка бібліятэкі (рэд. Budzma.org)), якая займаецца развіццём музея, працавала з беларускімі гісторыкамі над канцэпцыяй музея. Зараз ён будзе выглядаць больш структурна, і ў ім будзе навукова і комплексна паказвацца гісторыя Беларусі – праз мапы, праз лінгвістычную эвалюцыю і іншыя аспекты.

Мы планавалі адкрыць музей яшчэ ў пачатку года, але, на жаль, праца зацягнулася. Засталіся зусім дробныя рэчы зрабіць, якія патрабуюць больш часу.

**– Не так даўно Скарынаўцы перадалі архіў Рады БНР. Чаму менавіта вам?**

– Па-першае, гэта было асабістае жаданне Міколы Абрамчыка – перадаць яго архіў менавіта Скарынаўцы.

Па-другое, тут ёсць умовы. Яшчэ такога месца па-за межамі Беларусі няма, дзе маглі б збірацца беларускія архівы. А ў нас знаходзіцца вялікая колькасць архіваў. І гэта вельмі каштоўна для даследчыкаў.

Ключавы дакумент эміграцыі: тастамент Васіля Захаркі (Прага, 6 сакавіка 1943 года). Гэтым актам ён перадаў паўнамоцтвы Прэзідэнта Рады БНР Міколу Абрамчыку, пасаду сакратара – Ларысе Геніюш, і наўпрост даручыў ім захаванне ўсяго дзяржаўнага архіва БНР. Фота: Рада БНР

**– Што цяпер найбольш цікавіць даследчыкаў у вашых фондах?**

– Мы маем вялікую колькасць матэрыялаў, вельмі разнастайных, якія прываблiваюць даследчыкаў розных навуковых напрамкаў. Яны часта цікавяцца музыкай, старажытнымі мапамі, беларускай этнаграфіяй і стардрукамі.

Але галоўная тэма бібліятэкі, якая, безумоўна, адрознівае яе ад іншых, – гэта “несавецкая Беларусь” XX стагоддзя, розныя матэрыялы: Заходняя Беларусь да Другой сусветнай вайны, Беласточчына, жыццё эміграцыйных суполак розных краін з часоў Першай сусветнай вайны да канца мінулага стагоддзя.



Злева направа: Яна Гетка (прафесар Варшаўскага ўніверсітэта), Каралiна Мацкевіч (куратарка і апякунка Скарынаўкі), Юры Грыбоўкі (прафесар Варшаўскага ўніверсітэта) і Павал Шаўцоў (апякун Скарынаўкі)

**– З якімі беларускімі і замежнымі ўстановамі вы цяпер супрацоўнічаеце?**

– З беларускімі інстытуцыямі цяпер стала крыху цяжэй супрацоўнічаць. Да 2020 года мы даволі шчыльна супрацоўнічалі, напрыклад, з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. У нас адбываліся супольныя імпрэзы з Брытанскай бібліятэкай і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Ладзілі вельмі цікавыя прэзентацыі разам.

Але пасля 2020 года ўсё стала складаней. Людзі змяніліся і там. Таму цяпер сувязі больш на персанальным узроўні, чым на інстытуцыйным.

Але мы ж старая арганізацыя, перажылі розныя перыяды беларускай гісторыі. Супрацоўніцтва заўсёды залежала ад таго, што адбываецца ў Беларусі.

А за межамі Беларусі супрацоўнічаем вельмі актыўна. Мы каардынуемся з беларускімі музеямі ў Польшчы і Літве. Таксама даволі цесна супрацоўнічаем з Варшаўскім універсітэтам.

Злева направа: Яна Гетка (прафесар Варшаўскага ўніверсітэта), Каралiна Мацкевіч (куратарка і апякунка Скарынаўкі), Юры Грыбоўкі (прафесар Варшаўскага ўніверсітэта) і Павал Шаўцоў (апякун Скарынаўкі). Фота з асабістага архіву Паўла Шаўцова

Заўсёды мелі і маем вельмі сцíслыя і цёплыя стасункі з беластоцкімі беларусамі, заўсёды саюз існаваў.

**– Распавядзіце, калі ласка, пра новыя праекты і планы.**

– У гэтым годзе мы плануем правесці шэраг канферэнцый і мерапрыемстваў. Зрабіць акцэнт на святкаванні 100-годдзя айца Надсана. Абавязкова працягнем будаўніцтва музея, асветніцкую і выдавецкую дзейнасць.

Наста Пабягунская, Budzma.org

адукацыя

# ЕГУ НЕ АДМОВІЦЦА АД НАБОРУ, АЛЕ ПАПЯРЭДЖВАЕ БЕЛАРУСАЎ ПРА НЕБЯСПЕКУ

Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт пацвердзіў, што будзе праводзіць уступную кампанію, аднак не плануе спецыяльных інфармацыйных актыўнасцяў для беларускіх абітурыентаў на фоне пагрозаў з боку беларускіх уладаў.

Як паведамілі "Белсату" ў ВНУ, універсітэт працягвае набор студэнтаў, бо там навучаюцца прадстаўнікі розных краін. У той жа час у ЕГУ адзначылі, што будуць улічваць пры гэтым дзеянні беларускіх уладаў.

"У ЕГУ навучаюцца студэнты з розных краін, таму прыёмная кампанія для патэнцыйных студэнтаў будзе арганізаваная. Аднак, улічваючы дзеянні беларускіх уладаў і магчымыя пагрозы для грамадзян гэтай краіны, універсітэт не плануе мэтанакіраваных мерапрыемстваў для беларускай аўдыторыі", – адзначаецца ў адказе ўніверсітэта для "Белсату".

Пры гэтым было адзначана, што ў агульнай камунікацыі студэнтам будуць раіць "вельмі адказна ацэньваць магчымыя рызыкі, звязаныя з рашэннямі іх дзяржаўных установаў".

У ЕГУ падкрэсліваюць, што ўніверсітэт дзейнічае ў Літве і абаронены літоўскім і еўрапейскім заканадаўствам, і гэтая абарона распаўсюджваецца таксама на беларускіх грамадзян.

"Нагадваем, што ЕГУ працуе ў Літве, абаронены і ахоўваецца літоўскім і еўрапейскім заканадаўствам. Беларускія грамадзяне, якія легальна працуюць і вучацца ў Літве, таксама абароненыя літоўскім заканадаўствам", – гаворыцца ў паведамленні.




"Белсат" звярнуўся ў ЕГУ па каментар на фоне прызнання ўстановы "экстрэмісцкай арганізацыяй" і ўзмацнення рыторыкі беларускіх уладаў вакол гэтага. У прыватнасці, у беларускай пракуратуры заявілі, што за навучанне, працу або фінансавыя аперацыі, звязаныя з ЕГУ, можа пагражаць крымінальная адказнасць. Паводле афіцыйных тлумачэнняў, аплата навучання або ахвяраванні могуць быць расцэненыя як "фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці", за што прадугледжана да пяці гадоў пазбаўлення волі.

У сярэдзіне красавіка 2026 года Вярхоўны суд Беларусі прызнаў ЕГУ "экстрэмісцкай арганізацыяй" і забараніў яго дзейнасць на тэрыторыі краіны. У самой установе гэтае рашэнне назвалі незаконным і падкрэслілі, што яно не мае юрыдычнай сілы ў межах літоўскага і міжнароднага права.

У Еўрасаюзе таксама асудзілі гэтае рашэнне, назваўшы яго атакай на акадэмічную свабоду і правы на адукацыю.

ЕГУ працуе ў Вільні з 2004 года пасля закрыцця ў Менску і застаецца адным з ключавых адукацыйных цэнтраў для беларускіх студэнтаў.

**Глафіра Жук, Раман Шавель, belsat.eu**

# ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ АНЛАЙН-ШКОЛА ВА УКРАІНЕ РАСПАЧАЛА НАБОР НА НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

У Першую беларускую анлайн-школу ва Украіне распачаўся набор на новы 2026/27 навучальны год. Пра гэта паведаміла заснавальніца школы Анастасія Шпакоўская на сваёй старонцы ў фэйсбуку.

"На жаль, нашы дзеці апынуліся закладнікамі палітычных падзеяў.

За ўсе шэсць год існавання Першай Беларускай школы ва Украіне, мы сутыкнуліся са шматлікімі гісторыямі барацьбы за веды і атэстаты нашых дзяцей.

Чаго тут толькі не было…і немажлівасць атрымаць дакументы з беларускай школы, і непаразуменне ў новых навучальных установах, і булінг і шмат-шмат дзіцячых траўмаў… адным словам боль… боль за тое, што столькі маленькіх беларусаў не маюць магчымасці якасна працягваць адукацыю.

Вымушаны страчваць час і жаданне вучыцца ўвогуле.

Ствараючы Першую беларускую анлайн-школу ва Украіне, я марыла зрабіць яе бясплатнай, спадзяючыся на падтрымку фондаў ці адукацыйных устаноў, якіх шмат было створана за астатнія шэсць год… На жаль.




Створаны цэлы шэраг ўстаноў, дзеля асвойвання бюджэтаў, але па факту ніводнай школы, якая б захоўвала беларускі вектар прадметаў і давала б паўнавартасную сярэднюю адукацыю, акрамя Першай беларускай анлайн-школы ва Украіне, не існуе.

Я ганаруся тым, што наша каманда працягвае працаваць і верыць у будучыню нашых дзяцей.

Я ганаруся тым, што мы маем магчымасць захаваць невялікія кошты за навучанне і даваць нашым вучням якасную адукацыю.

Мы пачынаем новы набор вучняў на наступны навучальны год, і будзем рады калі ўсе дзеці, якім патрэбна дапамога ў атэстацыі і навучанні прыйдуць да нас", – напісала Анастасія Шпакоўская.

Падрабязней пра школу чытайце па спасылцы <БУДЗЕ СПАСЫЛКА>.

Першая анлайн-школа ва Украіне працуе з кастрычніка 2020 года. Ідэя яе стварэння ўзнікла ў акторкі і спявачкі Анастасіі Шпакоўскай, якая ў канцы жніўня 2020 года была вымушаная з дзецьмі з'ехаць з Беларусі.

**budzma.org**

Беларускія мерапрыемствы па ўсім свеце @Budzma_razam_bot

**навіны**

# MALDZIS АЛІЧБАВАЎ АРХІЎ ПАРАФІІ З ГАРАДЗЕНШЧЫНЫ – ГАРТАЙЦЕ І ДЗЯЛІЦЕСЯ ЗНАХОДКАМІ

У агульным доступе – унікальныя сведчанні пра жыццё Гарадзеншчыны XIX стагоддзя.



Ініцыятыва MALDZIS ажыццявіла алічбаванне набытага сёлета на аўкцыёне ў Польшчы старадаўняга капіярыю – рукапіснага зборніка службовых дакументаў і перапіскі з касцёла ў Вялікіх Эйсмантах на Гарадзеншчыне.

Працы па сканаванні былі выкана용 ў Лодзі прадстаўнікамі спецыялізаванай кампаніі – Пятром Скандальскім і Мацеем Невядомскім – дзякуючы падтрымцы рэгулярных ахвярадаўцаў ініцыятывы MALDZIS. Ініцыятыва выказвае таксама шчырую падзяку за дапамогу ў арганізацыі алічбавання Алене Шаркевіч.

Кожная старонка старадаўняга зборніка вымагала далікатнага падыходу. У выніку атрымаўся PDF-файл памерам 1,7 ГБ – такі аб'ём звязаны з тым, што файл захаваны ў вельмі высокай якасці. Дзякуючы гэтаму ён добра надаецца для падрабязнага вывучэння.

Кажа кіраўнік ініцыятывы MALDZIS Павел Мацукевіч:

“Алічбаваныя архівы перастаюць быць недасяжнай рэдкасцю, схаванай у адзінкавым экзэмпляры. Яны становяцца агульным здабыткам – гісторыкі, краязнаўцы, даследнікі і проста цікаўныя людзі з любога кутка свету могуць працаваць з імі ў любы час. А значыць, імёны мясцовых жыхароў, сямейныя гісторыі, штодзённыя падзеі ваколіц Горадні XIX стагоддзя выходзяць з нябыту і вяртаюцца ў жывую памяць”.

MALDZIS запрашае ўсіх ахвотных пагартаць алічбаваную кнігу. Калі вы заўважыце імя, якое мае важнае гістарычнае ці культурнае значэнне, цікавы факт, незвычайную нататку ці нешта, што заслугоўвае ўвагі, – напішыце ім. Кожная знаходка дапаможа лепш зразумець наша мінулае.

У хуткім часе архіў чакае яшчэ адзін важны этап – рэстаўрацыя, пра якую мы паведамім асобна.

Нагадаем, што капіярый быў набыты на аўкцыёне ў Польшчы на сродкі мецэната ініцыятывы MALDZIS Іллі Пакроўскага. У будучыні кніга ў якасці грамадскага падарунка вернецца на сваё месца – у парафію імя Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Яна Непамука ў Вялікіх Эйсмантах.

maldzis.world

# У БРУСЕЛІ ПРАЙШОЎ ПІКЕТ СУПРАЦЬ ВАЙНЫ ВА УКРАІНЕ І ТЭРОРУ Ў БЕЛАРУСІ

З ініцыятывы актывістаў Беларуска-Еўрапейскага Задзіночання ў сталіцы Бельгіі каля амбасады Рэспублікі Беларусь адбыўся пікет супраць расейскай ваеннай агрэсіі ва Украіне і суўдзеле ў ёй беларускага боку. А таксама супраць акцый запалохвання і тэрору з боку рэжыму ў дачыненні да беларусаў замежжа, якія выступаюць супраць вайны і падтрымліваюць Украіну.




Пра рэакцыю на пікет з боку мясцовага грамадства гаворыць яго арганізатар – актывіст беларускай дыяспары з Антверпена Зміцер Піменаў:

– Людзі з вялікай цікавасцю падыходзілі. Спрабавалі з намі размаўляць. Мы не ўбачылі ніводнай негатыўнай рэакцыі да нашага пікету. Людзі праяўлялі салідарнасць. На сённяшні дзень, я бачу, гэта быў самы насычаны пазітыўнымі рэакцыямі да пікетоўцаў з пэўнымі пазітыўнымі пасыламі. Гэта было вельмі прыемна. Я лічу што падобныя пікеты праводзіць каля амбасады трэба.

Акрамя беларусаў з салідарнасці акцыю падтрымалі і прадстаўнікі ўкраінскай дыяспары.

А каб прыцягнуць увагу мясцовых жыхароў да патрабаванняў пікету сярод іх раздаваліся інфармацыйныя бюлетэні на французскай і ангельскай мовах.

Юрась Дзяшук, racyja.com

## Беларускі каляндар памятных дат на чэрвень 2026 года

**1 чэрвеня**
• 115 гадоў таму, у 1911-м, нарадзіўся Якуб Міско, пісьменнік. Памёр у 1981-м.
• 110 гадоў таму, у 1916-м, нарадзіўся Мікола Гваздоў, паэт.

**2 чэрвеня**
• 220 гадоў таму, у 1806-м, нарадзіўся Аляксандр Валадковіч, адзін з кіраўнікоў паўстання 1830–1831 гг. Памёр у 1862-м.

**4 чэрвеня**
• 40 гадоў таму, у 1986-м, памерла Канстанцыя Буйло (у замужжы Калечыц), паэтэса.

**7 чэрвеня**
• 50 гадоў таму, у 1976-м, памёр Міхась Машара, пісьменнік.

**8 чэрвеня**
• 70 гадоў таму, у 1956-м, памёр Юзюк Фарботка, паэт, заолаг.

**9 чэрвеня**
• 145 гадоў таму, у 1881-м, нарадзіўся Іван Луцкевіч, этнограф. Памёр у 1919-м.

**11 чэрвеня**
• 190 гадоў таму, у 1836-м, памёр Казімір Кантрым, рэдактар.
• 100 гадоў таму, у 1926-м, нарадзіўся Дзмітрый Сямёнаў, літаратар, дзеяч эміграцыі ў ЗША. Памёр у 1982-м.
• 60 гадоў таму, у 1966-м, памёр Сцяпан Баркоўскі, літаратуразнавец, этнограф.

**12 чэрвеня**
• 115 гадоў таму, у 1911-м, нарадзіўся Мікола Панькоў, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Памёр у 1995-м.

**13 чэрвеня**
• 300 гадоў таму, у 1726-м, нарадзіўся Антон Барташэвіч, філосаф. Памёр у 1768-м.

**14 чэрвеня**
• 120 гадоў таму, у 1896-м, нарадзіўся Пётр Татарыновіч, святар, літаратар, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Італіі і Ватыкане. Памёр у 1978-м.

**15 чэрвеня**
• 120 гадоў таму, у 1896-м, нарадзіўся Павел Каравайчык, пісьменнік. Растраляны ў 1937-м.
• 25 гадоў таму, у 2001-м, памёр Валерый Навіцкі (да 1945 г. Валянцін Новік), дзеяч эміграцыі ў Канадзе.

**18 чэрвеня**
• 220 гадоў таму, у 1806-м, нарадзіўся Міхаіл Валовіч, арганізатар нацыянальна-вызваленчага руху. Павешаны ў 1833-м.

**19 чэрвеня**
• 85 гадоў таму, у 1941-м, нарадзіўся Іван Ласкоў, пісьменнік. Памёр у 1994-м.

**23 чэрвеня**
• 80 гадоў таму, у 1946-м, у Рэгенсбургу заснавана Крывіцкае Навуковае Таварыства імя Францыска Скарыны (старшыня Янка Станкевіч).

**29 чэрвеня**
• 130 гадоў таму, у 1896-м, нарадзіўся Уладзіслаў Казлоўскі, паэт, выдавец. Забіты ў 1943-м.

**Беларусы ў свеце**
№ 5 (288), травень 2026
Інфармацыйны бюлетэнь
Супольнасць беларусаў
свету "Бацькаўшчына"

Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.
Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.

Адказныя за нумар –
Н. Шыдлоўская,
А. Макоўская

Наклад 250 асобнікаў

zbsb.info e-mail: zbsb.minsk@gmail.com